ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

'90

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
13
СНЕЖНЯ
№ 34 (1663)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ІДЗЁМ ДА РЫНКУ

## Не забудзьце закампасціраваць стыпендыю!

*Нават самай высокай студэнцкай стыпендыі ледзь-ледзь хапае, каб купіць жаночыя боцікі. Каб апрануцца хаця б напалову — трэба збіраць яе ў патаемную, недакранальную скрыню на працягу года...*

*Дык які ж сэнс быў павышаць мізэрную суму? На свеце ж не толькі адзенне, абутак і харчаванне існуюць. Стыпендыю студэнтам павысілі, каб засцерагчы іх ад росту цэн. Не ўсіх, зразумела. Але павышэнне платы за праезд у грамадскім транспарце надбаўка да стыпендыі, здаецца, кампенсуе.*

*Па прагнозах, якія пакуль больш падобныя на чуткі, з наступнага года адна паездка ў гарадскім аўтобусе будзе каштаваць нам 20 капеек. Значыць, у чатыры разы падаражае і кошт месячнага праязнога білета. Выходзіць, на ўсе віды транспарту ён будзе каштаваць для студэнтаў каля 9 рублёў. Гэта толькі здагадка. У Трансагенстве, куды мы звярнуліся з пытаннем аб будучым кошце праязных, нам паведамілі, што гэта стане вядома толькі 20 снежня, калі пачнецца продаж білетаў на студзень.*

*Так што застаецца ў нас яшчэ час падумаць і вырашыць: ператварыцца з новага года ў сытых «зайцаў», або быць галоднымі, але сумленнымі пасажырамі. Іншага выбару ў студэнта няма: не пражыць яму на стыпендую...*

## Фота-аматары!

Вы не лічыце за вялікі цяжар разам з падручнікамі прыхапіць на заняткі фотаапарат? Не забываецеся ў складанай сітуацыі і нязручны момант зафіксаваць усё самае цікавае?

Вы ў гушчы жыцця — дык прыносьце свае здымкі да нас, і вашых герояў убачыць увесь універсітэт.

Тэмы для сюжэтаў — без абмежавання — вучоба, спорт, адпачынак...

ГАЛОЎНАЕ, ЦІКАВЫ ЗДЫМАК! І ВАС ВЕТЛІВА СУСТРЭНУЦЬ У РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» (ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАКОЙ 74, 75).



## ХТО НА СМЕЛАГА?

Тры гады назад у Мінску адбыўся Устаноўчы з'езд беларускіх дызайнераў, вынікам работы якога стала стварэнне новай творчай арганізацыі — Саюза дызайнераў. На жаль, аб якіх-небудзь яскравых падзеях і дасягненнях за мінулы адрэзак часу гаварыць цяжка. Дызайн як новая дзяржаўная структура амаль не знаходзіць падтрымкі ў выглядзе ўрадавых праграм развіцця. Прамыславікі таксама не вельмі звяртаюць увагу на творчыя пошукі дызайнераў: не да вышукаў — таварны голад, і так возьмуць усё!

Прадукцыя Людмілы Кажуры — карпусы гадзіннікаў — на нашых руках, але шмат чаго засталося ў эскізах. На жаль, рамкі вытворчых праграм нашмат вузейшыя, чым фантазія дызайнера ВА «Інтэграл».

Матацыкл, які прыдумалі Генадзь і Юлія Парафенюкі для работнікаў ДАІ, многія знойдуць незвычайным. Але ці не яна — смелая ідэя — рухае жыццё і творчасць наперад.

Фота С. ГРЫЦА.

ШТО ПРАЎДА, ТО...

## БІЛЕТ НА АБЕД

*Колькі будзе каштаваць звычайны абед у студэнцкай сталоўцы, якая ні якасцю прыгатавання, ні колькасцю далікатэсаў не вызначаецца?*

***А. ЛЕЎНІК,***
***студэнт.***

З РАЗМОВЫ З АДКАЗНЫМІ АСОБАМІ

Галіна Раманаўна ПЛЮХІНА, дырэктар сталовай № 33: Усё залежыць ад павышэння рознічных цэн на прадукты. Не ведаю, праўда, ці застанецца ранейшай (16 працэнтаў) нацэнка на прыгатаваныя ў сталовай стравы.

Міхаіл Іванавіч СТОМА, начальнік фінансавага аддзела ўпраўлення грамадскага харчавання Мінгарвыканкома: Пытанне складанае. Не бяруся адказваць на яго. Бо ўсё, што датычыць будучых рознічных цэн, толькі вывучаецца. Зразумела адно: цяжар рынку ляжа і на плечы студэнтаў.

Цяпер і ты, паважаны чытач, павінен скарыцца, як мы, калі прыйшлі да высновы: НІХТО НЕ ВЕДАЕ, ЯКІМ СТАНЕ КОШТ СТУДЭНЦКАГА АБЕДУ.

Усе раяць рыхтавацца да горшага. А партыйны камітэт універсітэта сумесна з прафкомам студэнтаў прыняў рашэнне звярнуцца да рэктарата з просьбай аб хадайніцтве ў Саўмін БССР аб выдзяленні сродкаў для датацый студэнцкіх абедаў, каб іх кошт не перавышаў цяперашні. Як дзейнічаць далей: ці то выдаваць уваходныя білеты, ці то ўводзіць і тут звыклую ўжо талонную сістэму, пакуль невядома.

## Прадаюцца адзнакі

Гавораць, у РТІ і інстытуце культуры будзе так у час зімовай сесіі: не здаўшы залік ці экзамен з першай спробы, другі раз студэнты будуць вымушаны прыходзіць да экзаменатара з кашальком. Але канчатковага рашэння ў гэтых ВНУ пакуль не прынялі, ідзе абмеркаванне. Значыць, яшчэ можна паспрачацца — потым будзем позна.

«ЗА». Можа, з'явіцца доўгачаканы сродак пакарання нядбайных студэнтаў. Папрывыкалі яны здаваць кожны іспыт па пяць разоў і нічога — нават стыпендыю атрымліваюць.

Магчыма, плата за пераздачы стане дадаткам у бюджэт выкладчыкаў. Раней жа, экзаменуючы студэнтаў паўторна і губляючы на гэта шмат часу, яны нічога не атрымлівалі.

ВНУ будзе лягчэй сустрэцца з тварам рыначнай эканомікі, калі яны атрымаюць дапамогу і з кішэняў уласных студэнтаў.

І, нарэшце, ёсць надзея, што для вучобы грошы могуць быць такім жа дзейсным стымулам, як і для працы. Раптам зробяць яны студэнтаў больш цікаўнымі і разумнымі?

**«СУПРАЦЬ».** Нядбайныя студэнты могуць, наадварот, узрадавацца грашоваму прыкрыццю іх «няведаў». Гэта ж любата: плаці сабе і вучыся, не маючы ні папрокаў, ні пачуцця сораму — грошы ж свае, уласныя.

Неаб'ектыўныя выкладчыкі будуць вітаць дадатковую магчымасць зарабіць і... стануць яшчэ больш суб'ектыўнымі, пачнуць прымушаць студэнтаў вяртацца да іх з залікоўкамі і грашыма як мага часцей.

Рынак не страшны таму, хто мае аднадумцаў і прыхільнікаў. Ці будуць яны з ліку студэнтаў у іх навучальнай установы, калі яна пачне абіраць і без таго дзіравыя кашалькі сваіх падапечных?

Грашовы стымул — справа надзейная. Але калі расклад іспытаў прадугледжвае іх ледзь не штодзённа, калі ўзровень асобных выкладчыкаў не толькі не дапамагае, а нават перашкаджае студэнтам добра рыхтавацца, калі яны займаюцца ў аўдыторыях, дзе столь можа зваліцца ў любы момант, калі катастрафічна не хапае неабходнага абсталявання... І сталоўкі... і паліклінікі... і бібліятэкі... і інтэрнаты... Калі ўся наша сістэма адукацыі крочыць недзе ззаду — адзін крок наперад у выглядзе студэнцкіх грошай на выкладчыцкім стале, пэўна, не перанясе цяжкае цела адукацыі ў светлую будучыню. Ці ёсць іншыя меркаванні?

ДАЧЫТАЛІСЯ!

## Рубель на газету

***У панядзелак са свежых — толькі «Правда» і «Известия». «Правда» ёсць яшчэ за мінулы чацвер, але кіяскёр збіраецца прадаць яе ў першую чаргу. Між тым, не так гэта проста: на абгортванне «селядцоў» газеты ва універсітэцкім кіёску, што ў галоўным корпусе, амаль не купляюць.***

...Раней газеты бралі лепш — менш іх тады было, і не паспела яшчэ друкаваная прадукцыя нагнаць нам масавую аскому. Пэўна, пра тое не трэба напамінаць нават першакурснікам, гэта ж справы нядаўнія. А тым, хто паспеў так прывыкнуць да абкладзеных газетнымі стосамі паліц, што не ўяўляе іншага відовішча на тым жа месцы, варта звярнуцца да гаспадыні нашага кіёска Еўдакіі Харытоўны Юзефовіч. Яна працуе тут ужо амаль 11 гадоў і можа зрабіць самыя розныя параўнанні наконт наяўнасці друкаваных выданняў.

Вось такое відавочнае, напрыклад. Раней замежныя газеты і часопісы не залежваліся доўга, зараз — быццам ахоўваюцца ад пакупнікоў. Іх надзейны вартаўнік — кошт, які вырас у некалькі разоў.

«Собеседник» застаецца такім жа папулярным, як і ў першыя гады свайго існавання. Звычайна яго прывозяць у наш кіёск у колькасці 20 экземпляраў, якія і разыходзяцца імгненна.

«Правда» і «Комсомольская правда» прыязджаюць да нас у такім жа саставе — 20 экземпляраў. Маладзейшая сяброўка заўсёды апярэджае старэйшую па хуткасці перамяшчэння ў рукі чытачоў.

Рэкардсмен пасля «Комсомолки» — «Знамя юности», хоць раніцай дзверы галоўнага корпуса адчыняюць не толькі студэнты і маладыя выкладчыкі...

Калісьці да кіёска часцяком падыходзілі тыя, хто чакаў з'яўлення «таўстых» часопісаў. Сёння, калі ласка — і «Октябрь», і «Дружба народов», і «Знамя»... Начыталіся ці дачыталіся? «Юность», дарэчы, па-ранейшаму не знайсці.

З'ява, аднолькавая для ўсіх кіёскаў «Саюздруку» сёння,— залежы камерцыйных выданняў. Здаецца, парушылі іх стваральнікі нейкую разумную коштавую мяжу. Праўда, «Двое» купляюць і за 60, і за 80 капеек, а «Счастливый случай» (за 70) Еўдакія Харытонаўна вымушана на спісанне аддаваць.

Пра рэкламу свайго тавару яна не прасіла, бо колькі б экземпляраў ні прадавала, заробак свой не можа змяніць, хіба толькі прыбавіць 8 рублёў у квартал... А вы ўсё роўна не забывайцеся на яе ўтульны кіёск — пакуль не ўсе газеты каштуюць рубель.

ЧЫРВОНЫ РАДОК

Аб вялікім дэфіцыце журналісцкіх кадраў і не меншым — трывалых ведаў у студэнтаў і абнаўленні ў сувязі з гэтым усіх курсаў — скарачэнні ці ўвядзенні альтэрнатыўных — ішла гаворка на партыйным сходзе, які адбыўся 6 снежня на факультэце журналістыкі. З дакладам выступіў А. Г. Слука. У спрэчках — М. Я. Цікоцкі, Е. Л. Бондарава, А. І. Наркевіч, Р. В. Булацкі.

Была прынята ў члены КПСС выкладчык І. А. Тоўсцік.

* * *

На філфаку з'явіліся адразу дзве новыя кафедры... замест адной старой. Яна называлася кафедра методыкі выкладання рускай і беларускай мовы і літаратуры. «Дочкі» вельмі падобныя на «маці»: кафедра методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры і кафедра методыкі выкладання рускай мовы і літаратуры.

* * *

4—5 снежня ва універсітэце праходзіла міжрэспубліканская навуковая канферэнцыя, прысвечаная памяці аднаго з заснавальнікаў беларускай школы звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў прафесара Юрыя Багданава. У пасяджэннях канферэнцыі, акрамя беларускіх матэматыкаў, прынялі ўдзел іх калегі з Масквы, Ленінграда, Кіева, Тбілісі, Свярдлоўска, Рыгі, Сафіі.

КАМПЕТЭНТНЫ СУБЯСЕДНІК

*Калісьці гэта былі толькі размовы, а студэнт па-ранейшаму добрасумленна вывучаў усё: і фізіку, і вышэйшую матэматыку, і гісторыю партыі, і логіку. Яго пераконвалі, што без усяго гэтага не адбудзецца як спецыяліст. Але часы мяняюцца, і пераход ВНУ да рынку прымусіў студэнта і на гэту праблему паглядзець па-іншаму. Пагроза застацца беспрацоўным дапамагла яму зрабіць вывад: галоўнае для будучай работы — прафесійныя навыкі. Таму студэнт вырашыў скінуць са сваіх плеч груз непатрэбных дысцыплін. «Ці мае ён рацыю?» — пытаюся ў намесніка дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі, кандыдата фізіка-матэматычных навук Юрыя Іосіфавіча ВАРАТНІЦКАГА.*

# І «НЕПАТРЭБНЫЯ» ПАТРЭБНЫ

— Цяжка сказаць, якія матывы рухалі студэнтамі, калі яны паўсталі супраць «лішніх» дысцыплін і, у асобных выпадках, адмовіліся вывучаць іх. Тым не менш раздзяленне такое сёння вызначылася даволі выразна: у кожным вучэбным плане ёсць прадметы неабходныя, што дакладна кладуцца ў канву спецыялізацыі, і тыя, якія спрабуюць аднесці да непатрэбных. Да апошніх звычайна адносяць грамадска-палітычныя курсы, а на тэхнічных факультэтах — усе гуманітарныя дысцыпліны.

Гэта натуральны працэс. Развіваецца навука і разам з ёй мяняецца наша ўяўленне аб адукацыі, аб тым, як трэба вучыць. І ўсё ж мы не павінны так катэгарычна падзяляць прадметы вучэбнай праграмы на «патрэбныя» і «непатрэбныя». Сучасны спецыяліст, на маю думку, павінен быць перш за ўсё адукаваным чалавекам у шырокім сэнсе гэтага слова: ад ведаў у сваёй прадметнай галіне да ўмення разабрацца практычна ў любым пытанні, у любой праблеме. Сённяшні выпускнік-радыёфізік павінен свабодна валодаць радыёфізічнымі метадамі даследавання, быць на «ты» з персанальнай вылічальнай тэхнікай і ў той жа час мець уяўленне аб філасофіі прыродазнаўства, напрыклад.

**— Зараз мы, па-сутнасці, скаціліся да абароны грамадскіх дысцыплін. Як вы лічыце, што прывяло да такіх хваравітых адносін студэнтаў і выкладчыкаў да гэтага цыкла?**

— У першую чаргу, дырэктыўнасць і зместу, і аб'ёму. Паглядзіце, што атрымліваецца. Аб'ём дысцыплін па спецыяльнасці, рабочыя праграмы гэтых курсаў — справа савета факультэта. Дзякуючы гэтаму мы падцягнулі іх на сучасны ўзровень і аднеслі ў разрад патрэбных.

Што ж датычыць грамадска-палітычных курсаў і грамадзянскай абароны ў тым ліку, то тут жорсткая зададзенасць, якая існуе, на жаль, і зараз, і вызначае амаль безнадзейнае адставанне ў выкладанні грамадскіх навук. Праводзячы ідэю роўнасці дысцыплін, неабходна даць савету права самому вырашаць, колькі гадзін адвесці на той ці іншы прадмет гэтага цыкла, дазволіць самім складаць тыпавыя праграмы і г. д. Калі ж пазнаёміцца з вучэбным планам нашага факультэта, то ствараецца ўражанне, што самыя важныя дысцыпліны ў нас — грамадзянская абарона і т. п.

**— Але, напэўна, яшчэ пакуль нікому не ўдалося адмяніць рашэнне «зверху»?**

— Такія прыклады, ёсць. У МДУ рабочыя праграмы грамадска-палітычных дысцыплін зацвярджаюцца на пасяджэннях метадычных камісій і саветаў факультэтаў, дзе гэтыя курсы чытаюцца. У нас пакуль такога няма. Але, напрыклад, мы дасягнулі нядрэнных кантактаў з кафедрай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў. З выкладчыкамі, якія працуюць у нас, мы абмеркавалі праграму курса, разам унеслі карэктывы. Безумоўна, было б вельмі добра мець такое ўзаемапаразуменне з астатнімі грамадска-палітычнымі кафедрамі. А ў ідэале — самім факультэтам вырашаць, што важней для нашых студэнтаў: курс сацыяльнай псіхалогіі ці палітэканоміі сацыялізму? Пакуль гэта не будзе зроблена, ніякая перабудова «зверху» не дапаможа. У рэшце рэшт, у дыпломе побач з подпісам рэктара стаіць подпіс дэкана — гэта менавіта тыя людзі, якія адказваюць за якасць падрыхтоўкі спецыяліста.

**— Сёння мы ўсё больш гаворым аб самастойным выбары дысцыплін. Ці заўсёды студэнт зможа выкарыстаць яго ў карысных мэтах?**

— Па-першае, гэта права не толькі студэнта. На верхнім узроўні яно павінна належаць рэктарату і савету факультэта, якія абавязаны вызначаць стратэгію падрыхтоўкі універсітэцкага спецыяліста. Наступны ўзровень — выкладчыкі, якія напаўняюць гэту дысцыпліну канкрэтным зместам. І, нарэшце, трэці — выбар студэнта. Зараз, калі дадзена права на свабоднае наведванне лекцый, а ўмоў для самападрыхтоўкі — амаль ніякіх: не хапае вучэбнай літаратуры і часта адзінай крыніцай інфармацыі для студэнта становіцца перапісаны з памылкамі канспект таварыша — такі «выбар» наўрад ці апраўданы. Вырашэнне праблемы бачыцца ў выбары паміж раўназначнымі па сваіх задачах і зместу дысцыплінамі, выбар паміж лектарамі, якія чытаюць на розных патоках. Пакуль толькі так можна гарантаваць падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў.

**— Вы не спрабавалі апрабіраваць такі варыянт на сваім факультэце?**



— На трэцім курсе мы прапануем выбраць адну дысцыпліну па спецыяльнасці з трох: імаверныя метады аналізу сігналаў і сістэм, асновы тэорыі аўтаматычнага кіравання ці лічбавая электроніка (частка другая). Самае цікавае, што многія студэнты выбіраюць не адзін, а два прадметы.

Па грамадска-палітычных курсах такія спробы робяцца ў выглядзе спецкурсаў, што чытаюцца па палітычнай гісторыі, філасофіі. Але рэальнай (поўнай) альтэрнатывы пакуль няма.

Шчыра кажучы, пры цяперашніх тэмпах развіцця сучаснай навукі, тэхналогіі цяжка гаварыць аб падрыхтоўцы спецыялістаў толькі па спецыялізацыі на дадзеным узроўні ведаў. Чым заўсёды адрозніваўся выпускнік універсітэта — сваёй адаптаванасцю да ўмоў будучай работы. А забяспечыць яе без ведання базавых дысцыплін і ў галіне спецыяльнасці, і ў іншых галінах немагчыма. Цяжка ўявіць спецыяліста, які лёгка адаптуецца, без шырокага кругагляду, умення думаць і абагульняць, кантактаваць з калегамі па рабоце, крытычна ацэньваць той аб'ём інфармацыі, які існуе зараз. Натуральна, што даць гэтыя якасці толькі на аснове дысцыплін па спецыяльнасці немагчыма.

І калі ўжо цалкам разабрацца з выбарам, то ў канчатковым выніку ён належыць не адміністрацыі, выкладчыку ці студэнту. Мы ніколі не выйдзем з каралеўства крывых люстэркаў, у якім зараз існуем, пакуль само жыццё, тыя прыдпрыемствы, навуковыя структуры, дзе будуць працаваць нашы выпускнікі, не пачнуць дакладна і разумна кіраваць гэтым працэсам.

**— Юрый Іосіфавіч, магчыма ёсць сэнс дазволіць студэнтам самастойна вывучаць той ці іншы курс, а для кантролю ўвесці залік?**

— Тут няма нічога новага. Такая практыка існавала заўсёды. У мінулым годзе на факультэце быў факультатыў па оптаэлектроніцы, зараз — па гісторыі БССР. Толькі я не разумею факультатыва без выбару. Іншая справа, што калі ў нас з'явяцца чытальныя залы, магчымасці для работы ў інтэрнатах, будзе дастаткова вучэбнай літаратуры, то мы міжволі задумаемся: ці варта чытаць увесь курс, можа дастаткова некалькі лекцый, якія б раскрылі найбольш цяжкія і складаныя тэмы? Вось гэта ўжо дасць студэнту лішнія вольныя хвіліны.

**— Неяк у размове давялося пачуць ад студэнтаў такі аргумент: мы ўжо будзем працаўладкоўвацца пры рынку, і каб знайсці работу, галоўнае, мець выдатную прафесійную падрыхтоўку? Што можаце сказаць наконт гэтага вы?**

— У пэўнай ступені яны правы. Але, спадзяюся, з пераходам да рынку само сабой адпадзе пытанне аб «патрэбных» і «непатрэбных» дысцыплінах. Перспектыва застацца без работы стане выдатным стымулам для атрымання якасных ведаў, а плата за вучобу прымусіць больш свядома выбіраць вучэбныя курсы. Кожны будзе сувымяраць свае здольнасці з магчымасцю ўладкавацца на работу, свой выбар дысцыплін — з жыццёвымі патрэбамі.

У гэту сістэму неабходна ўцягнуць і выкладчыкаў, каб ім было выгадна чытаць сучасныя курсы. Лад думак у іх павінен быць прыкладна такім: калі я буду выдатна працаваць, даваць студэнтам сучасныя веды і гэтак жа будуць рабіць мае калегі, то я больш зараблю. Адміністратар, безумоўна, таксама прагаласуе «за», таму што чым больш спецыялістаў будзе рыхтаваць яго ўстанова, тым больш трывалым акажацца яе становішча.

Гутарыла
З. АЛЯШКЕВІЧ.

СЛУЖБА 03

# ЗАГАРТОЎВАЕ ПАВЕТРА

У мінулым нумары газеты («Беларускі універсітэт», № 33 за 6 снежня) мы вялі размову аб загартоўванні і значэнні яго для арганізму чалавека. Калі чалавек хоча менш хварэць, у гэтым дапаможа яму загартоўванне вадой. А яшчэ — паветрам. Дарэчы, увесь комплекс працэдур лепш за ўсё пачынаць менавіта з паветраных ваннаў. Яны лёгка ўспрымаюцца арганізмам.

Паветраныя ванны прымаюць у добра праветраным памяшканні. Распранацца трэба хутка, каб паветра аказвала ўздзеянне на ўсю паверхню аголенага цела. Прыём халодных і не надта паветраных ваннаў варта спалучаць з энергічным рухам, а потым хуценька расцерці цела і прыняць цёплы душ.

Калі вы дасягнулі пэўнай ступені загартоўкі, можна выйсці з памяшкання на адкрытае паветра. Лепш за ўсё рабіць гэта ў цёплую пару года.

У сырое і ветранае надвор'е працягласць паветраных працэдур скарачаецца. Найбольшы час знаходжання чалавека на свежым паветры — прагулкі пешшу і на лыжах, паляванне, рыбная лоўля, турызм. Яны аказваюць станоўчае ўздзеянне на арганізм. Вельмі карысна зімой спаць з адчыненай форткай, а летам нядрэнна адчыніць усё акно. Паветраныя ванны лепш за ўсё прымаць у час выканання на вуліцы розных фізічных практыкаванняў.

Працягласць працэдуры залежыць ад загартаванасці таго, хто займаецца, яго індывідуальных здольнасцей, тэмпературы навакольнага асяроддзя. Спачатку, з нагоды аддачы цяпла, узнікае адчуванне холаду, потым кравяносныя сасуды расшыраюцца і гэта адчуванне змяняецца прыемнай цеплынёй. Пры з'яўленні дрыжыкаў (у народзе кажуць, цела стала, як гусіная скура) трэба адразу ж апрануцца, прабегчы ці зрабіць некалькі фізічных практыкаванняў.

У медыцыне ёсць такое словаспалучэнне, кантраснае загартоўванне — гэта ўздзеянне халоднай вады ці паветра на разагрэтае цела ці гарачай вады (паветра, пары) — на ахалоджанае. Яно трэніруе сасуды, прывучае арганізм да хуткай змены рэакцый. Кантраснае загартоўванне павышае супраціўляльнасць арганізму да хвароб, паляпшае кровазварот, абмен рэчываў. Яно рэкамендуецца абсалютна здаровым людзям, добра загартаваным, якія ўжо прывыклі да іншых працэдур. Перш чым прыступіць да любой загартоўваючай працэдуры, неабходна параіцца з урачом.

Магчыма, многія з вас любяць хадзіць па выхадных у баню. Тут таксама можна сумясціць прыемнае з карысным. Калі вы спачатку пабудзеце ў парылцы, а потым абльецеся халоднай вадой, то ведайце: гэта таксама эфектыўны від загартоўвання. Рэзкі кантраст тэмператур выдатна трэніруе апарат тэрмарэгуляцыі. Але памятайце: гэта працэдура моцна ўздзейнічае на сардэчна-сасудзістую сістэму, таму пачынаць яе можна толькі з дазволу ўрача.

Усё больш папулярнымі становяцца сауна, фінская баня — эфектыўныя сродкі нялекавага метаду паляпшэння і ўмацавання здароўя. Але ходзячы ў іх, таксама трэба захоўваць меры перасцярогі. Знаходзячыся ў сауне ці парылцы, кантралюйце сваё самаадчуванне. Не дапускайце пачашчэння пульсу, з'яўлення галаўных боляў, парушэння рытму сэрца, слабасці. Калі такія сімптомы з'явіліся, адразу ж пакіньце сауну.

Яшчэ раз напамінаем: перш чым прыступіць да любой загартоўваючай працэдуры, абавязкова парайцеся з урачом.

Г. ГАЛЬЧАНЮК,
урач.

САКРЭТ ФІРМЫ

# Бібліятэка робіць бізнес

**У чытальнай зале бібліятэкі універсітэта Растова-на-Доне прадаюцца кнігі з абменнага фонду. Гадамі пакрываліся пылам на паліцах, а тут — атрымалі другое жыццё ў прыватных бібліятэках.**

**Да продажу было падрыхтавана пяць тысяч кніг. У першы ж дзень прадалі на 2500 рублёў. Цікаўнасць чытачоў непрадказальная — напрыклад, з 40 экземпляраў «Молодой гвардии» засталося толькі 6.**

**Усё што пажадаеце, але бібліятэка ў ролі гандляркі? Хто даў такое права? Загад Міністэрства культуры СССР, які дазволіў бібліятэкам рэалізоўваць шматэкземплярную літаратуру. Калі праз магазін, дык 40 працэнтаў прыбытку, натуральна, застаецца рэалізатару. А супрацоўнікі бібліятэкі вырашылі іначай — з атрыманых грошай 40 працэнтаў пойдуць на прэміі, а 60 — на папаўненне фондаў новай літаратурай і іншыя надзённыя патрэбы.**

А. ШЭВЕЛЬ.

# Гэта павінен ведаць кожны

**У Барнаульскім педінстытуце ліквідавалі ваенную кафедру, але хлопцаў без справы не пакінулі. Іх падключылі да групы студэнтак, якія займаюцца медыцынскай падрыхтоўкай. Зараз хлопцы рыхтуюцца да экзамену і вучаць пытанні, сярод якіх кармленне дзіцяці груддзю, асаблівасці цяжарнасці і многае іншае.**

БЕЗ ВІЗЫ

# МЕНЮ ДЛЯ СТУДЭНТА



У пачатку кожнага семестра студэнты універсітэта Калгары выстройваюцца ў чаргу ў Максвэл-Холе. З раскладам у руках яны спрабуюць запісацца на новыя курсы ці адмовіцца ад старых. Універсітэт Калгары прапануе курсы для атрымання ступені ў галіне сацыяльных і прыкладных навук, гуманітарных дысцыплін, мастацтва, фізічнай культуры, інжынернай справы, педагогікі, юрыспрудэнцыі, кіравання, медыцыны і сацыяльнага забеспячэння. Вынікі даследаванняў сацыялагічнай лабараторыі пры Студэнцкім Саюзе сведчаць, што 88 працэнтаў навучэнцаў займаюцца на курсах, якія адпавядаюць іх выбару.

Расклад звычайна атрымліваецца неблагі, бо складаецца з імкненнем стварыць максімум выгод для студэнтаў. Таму многія застаюцца задаволенымі. Але як жа мы забыліся на буркуноў? Тых, хто не змог трапіць на абраны семінар, бо ў свой час не вызначыўся з асноўным курсам ці не меў дастатковай падрыхтоўкі.

— Думаю, камп'ютэрная рэгістрацыя — дастаткова зручная сістэма. Я чуў, што ў іншых вучэбных установах выкарыстоўваюцца больш жорсткія метады,— гаворыць трэцякурснік Біл Крэнсан.

Здараецца, студэнты не атрымліваюць магчымасці запісацца на тыя ці іншыя курсы — кафедры не маюць дастатковай колькасці фінансавых сродкаў, каб запрасіць новых выкладчыкаў. Што рабіць, дэфіцыт не толькі нам выпаў на долю.

З. МАРАВА.

ПАСПРАБУЕМ!

# Аўкцыён! Аўкцыён?










Аўкцыён — з гэтым мы яшчэ не зусім звыкліся, таму прымаць удзел у такім мерапрыемстве ў ПК тонкасуконнага камбіната прыйшло не вельмі шмат людзей. Як адзначыў аўкцынатар Аляксандр Варламаў: «Аўкцыён — гэта для багатых людзей», а ці шмат сёння сярод нас тых, хто сябе такім лічыць.

Беларускі філіял творчага цэнтра праграмы «Дзеці — творцы XXI стагоддзя» правозіў гэты аўкцыён з мэтаю дапамагчы перад Калядамі тым, хто лічыць свае грошы з дакладнасцю да капейкі. Такіх людзей сёння ў нас шмат.

Фота С. ГРЫЦА.

ПА СЛЯДАХ НАШУМЕЛАЙ ГІСТОРЫІ

# ЗЛАВІЦЬ НЛА НЕ ЎДАЛОСЯ

*«Пары-матч» надрукаваў артыкул Мары-Тэрэзы дэ Брос, які прыводзіцца са скарачэннямі.*

Зараз нават ваенныя, якія ўпарта не жадалі гаварыць пра НЛА, пацвярджаюць факт іх існавання. 22 чэрвеня бельгійскія ВПС упершыню згадзіліся абнародаваць, праўда, часткова, асноўны дакумент-дасье, які зусім не належыць да свету фантастыкі.

У гэты дзень, прайшоўшы ўсе віды праверкі, я аказалася недалёка ад Бруселя ў штабе бельгійскіх ВПС. У невялікім пакоі палкоўнік дэ Брувер, начальнік аператыўнага аддзела бельгійскіх ВПС, уключыў відэамагнітафон. На экране з'явіўся фільм з «чорнай скрыні» самалёта, пасланага ноччу з 30 на 31 сакавіка гэтага года на праследаванне НЛА. Гэта яшчэ не было вялікае паляванне, якое пачалося праз два тыдні, калі ўся Бельгія спрабавала, але безвынікова, выслежваць НЛА. Размова ідзе аб заданні, якое знаходзілася да гэтага часу ў сакрэце.

Бельгійскія ВПС, як і ўсе іншыя, маюць звышгукавыя самалёты, гатовыя ў любы момант сутак узляцець за пяць хвілін. У дадзеным выпадку гэта былі два аднамесныя самалёты Ф-16, аснашчаныя ракетамі. Штаб ВПС захоўвае асцярожнасць. У мінулыя месяцы на месца здарэння накіроўваліся двойчы два знішчальнікі, але беспаспяхова. Першы раз яны не выявілі нічога, другі — толькі светлавыя плямы, што ўзніклі дзякуючы выпраменьванням лазераў, якія знаходзіліся ў начной пацешлівай установе.

У тую ноч 30 сакавіка пасля неаднаразовых сігналаў, і, у прыватнасці, ад капітана жандармерыі Пінсана, штаб вырашыў, нарэшце, правесці ўважлівую праверку. Акрамя шматлікіх відавочцаў, што назіралі фенамен візуальна, лакатар НАТА ў Глоне (на паўднёвы захад ад Бруселя) і лакатар у Семерзаку (на захад ад сталіцы), што кантралюе грамадзянскі і ваенны паветраны рух на ўсёй тэрыторыі Бельгіі, перахапілі адлюстраваны сігнал НЛА. Радыус дзеяння абодвух лакатараў (300 км) з лішкам ахопліваў зону назірання. Рэльеф у гэтым раёне выражаны даволі слаба, што стварае ідэальныя ўмовы для выяўлення лакатарамі любога аб'екта, які ляціць на вышыні звыш 200 метраў. Тым не менш, штаб бельгійскіх ВПС правёў карпатлівую 50-мінутную праверку для таго, каб пазбегнуць усялякіх памылак. Два лакатары паказалі адно і тое ж месцазнаходжанне аб'екта. Выдатныя атмасферныя ўмовы выключылі ўсялякую магчымасць хлуслівага сігнала ў сувязі з фенаменам тэмпературнай інверсіі.

Усе самалёты (грамадзянскія ці ваенныя) аснашчаны сістэмай радыёлакацыйных аўтаадказчыкаў, якая дазваляе неадкладнае іх апазнанне дзякуючы кадыраванаму сігналу, што з'яўляецца на экране лакатара.

Адлюстраваны сігнал, прыняты ў тую ноч, быў такім жа, як у самалёта, які ляцеў на вельмі малой хуткасці (50 км/г) і часта мяняў курс і вышыню, аднак дадзены аб'ект сам не падаваў ніякіх сігналаў, якія дазволілі б яго апазнаць.

Бельгійскія ВПС не могуць дазволіць аблёту сваёй тэрыторыі неапазнанымі лятаючымі аб'ектамі. Таму ў 00.05 мінут два самалёты Ф-16 атрымалі загад узляцець і праследаваць «чужака». Вядучы не адрываў вачэй ад свайго лакатара суправаджэння, які ў начны час з'яўляецца для яго найлепшым «органам зроку». Гэты лакатар з электронным кіраваннем не зафіксаваны цвёрда і дазваляе пошук цэлі па гарызанталі і вертыкалі з аглядам у 90 градусаў. Знаходзячыся за некалькі дзесяткаў метраў у баку ад яго і крыху ззаду, вядомы паўтараў манеўры свайго вядучага, сканцэнтраваўшыся на кантактах з КП.

Нечакана на экранах РЛС абодвух самалётаў з'явіўся невядомы аб'ект у выглядзе кропкі, якая рухалася. Націснуўшы на рычаг, падобны на той, які выкарыстоўваецца ў відэагульнях, пілоты падалі свайму бартавому камп'ютэру каманду «суправаджэнне цэлі»: пляма на экране ператварылася ў ромб. Зараз лакатары абодвух самалётаў будуць аўтаматычна наводзіцца на гэты аб'ект, указваючы на экране яго становішча, адлегласць да яго і яго хуткасць. Ён зусім блізка.

Гэтыя кадры, з якімі палкоўнік дэ Брувер пазнаёміў нас у парадку выключэння, суправаджаюцца запісам радыёабмену паміж пілотамі. Абодва відавочна ўсхваляваныя.

«Паглядзіце,— гаворыць палкоўнік, спыніўшы адлюстраванне на экране і паказваючы на ромб.— На нашым ваенным жаргоне гэта называецца паспяховым захопам».

— А што гэта азначае канкрэтна?

— Нашы знішчальнікі аснашчаны саманаводзячымі ракетамі, якія ў выпадку адпаведнага загада паразілі б цэль. Вядома, у дадзеным выпадку аб гэтым не магло быць і размовы. Мы хацелі толькі апазнаць невядомы аб'ект.

Лакатары ўтрымлівалі цэль 6 секунд, увесь час паскараючы рух і ідучы з хуткасцю 280 км/гадзіну, дасягнуўшы ўсяго за секунду хуткасці 1.800 км/гадзіну, апусціўшыся пры гэтым з вышыні 3.000 метраў да вышыні 1.700 метраў. Гэта фантастычнае паскарэнне складае 40 g. І калі б на борце знаходзіўся чалавек, ён абавязкова загінуў бы (пілот знішчальніка можа вытрымаць нагрузку не больш чым 8g. Траекторыя палёту ЛА была проста надзвычайнай. З вышыні 1.700 метраў ён стаў яшчэ больш імкліва зніжацца і на вышыні менш 200 метраў стаў нябачным, як для лакатараў на самалётах Ф-16, так і для наземных РЛС — у Глоне і Семерзаку. Гэты вялікі паўднёвы прыгарад Бруселя пастаянна ўсыпаны мільгаючымі агнямі, таму лётчыкі не ў стане візуальна адрозніваць якія-небудзь аб'екты.

У любым выпадку Ф-16 ніяк не маглі дагнаць аб'ект на такой малой вышыні, дзе з-за шчыльнасці паветра яны не могуць ляцець з хуткасцю больш за 1300 км/гадзіну. У выпадку перавышэння яе, удакладняе палкоўнік Брувер, турбіны проста разваліліся б з-за перанагрэву кампрэсараў рухавікоў. Як бачым,«у паводзінах НЛА ёсць свая логіка».

Падобна, што загадкавы апарат знарок спрабаваў выслізнуць ад знішчальнікаў. У наступную гадзіну той жа «сцэнарый» паўтарыўся двойчы.

НЛА літаральна гуляў у схованкі са знішчальнікамі. Ён рэзка апускаўся да зямлі, каб увільнуць ад бартавых і наземных лакатараў, потым спакойна падымаўся на невялікай хуткасці крыху вышэй, зноў з'яўляючыся на экранах лакатараў, пасля чаго пачыналася новая спроба перахопу.

Гэтыя дзіўныя манеўры назіраліся з зямлі многімі відавочцамі (уключаючы 20 жандармаў), якія бачылі НЛА і самалёты Ф-16. Але ніхто з прысутных не чуў на працягу ўсіх 75 мінут, пакуль працягваўся «спектакль», характэрнага выбуховага гука, якім звычайна суправаджаецца пераход ЛА гукавога бар'еру. Ніякіх разбурэнняў таксама не было: а, улічваючы хуткасць аб'екта і нязначныя вышыні, павінна было б выляцець шмат вокнаў.

Упершыню ў свеце журналіст атрымаў дазвол пазнаёміцца з дакументам, які пацвярджае спробу перахопу НЛА. Я бачыла на экране захоп цэлі лакатарам, а таксама вылічаныя ЭВМ параметры палёту НЛА і неверагодныя змены ім сваёй хуткасці.

Азнаёміўшыся з гэтымі ашаламляльнымі матэрыяламі, я засыпала палкоўніка дэ Брувера пытаннямі. Напрыклад, ці не мог быць гэты аб'ект шарам-зондам?

«Ні ў якім выпадку. Аб'ект вёў сябе так, як калі б зусім не залежаў ад напрамку ветра і паветраных патокаў. І акрамя таго, мы дасканала вывучылі метэаўмовы. Мы не надрукавалі справаздачу адразу ж менавіта таму, што хацелі правесці ўсю неабходную праверку. Наша абаронная сістэма не падрыхтавана да такога роду з'яў. Нам неабходны быў час для аналізу і інтэрпрэтацыі дадзеных, атрыманых дзякуючы камп'ютэрам і відэаздымцы, зробленай знішчальнікамі».

Але, магчыма, гэта якая-небудзь з'ява прыроды ці вяртанне ў атмасферу абломкаў ракеты? Не, метэарыт ці абломак ракеты не ўваходзіць у атмасферу зігзагападобна, а аналіз запісу радыёлакацыйных адлюстраванняў паказаў неаднаразовую змену напрамку. Акрамя таго, атмасферныя ўмовы выключалі ўсялякі электрамагнітны фенамен.

— А раптам,— спытала я,— гэта быў славуты амерыканскі «нябачны» самалёт Ф-117-А-«Стэлс», які многія прымаюць за НЛА?

— Гэты самалёт зусім не разлічаны на палёт на малых вышынях. Акрамя таго, яго мінімальная хуткасць складае 278 км/гадзіну, у той час як хуткасць нашага аб'екта падала да 40 км/ гадзіну. Самалёт Ф-117-А не мае цягавых рэактыўных рухавікоў, якія дазволілі б яму лятаць так павольна. Акрамя таго, ніводзін самалёт не здольны ляцець з хуткасцю 1.800 км/гадзіну так нізка над зямлёй у такой шчыльнай атмасферы і пры гэтым без гукавога ўдару. Тут ён падаў мне тэлекс, адрасаваны ваенным аташэ пасольства ЗША ў штаб бельгійскіх ВПС з пацвярджэннем, што ніводзін самалёт Ф-117-А ніколі не размяшчаўся на еўрапейскай тэрыторыі.

Друк быў здзіўлены няўдачай гэтага пасхальнага палявання. Зараз жа ўсё тлумачыцца. Нельга сказаць, што НЛА не выйшаў на яўку, таму што яго назіралі з зямлі. Але калі аб'ект заставаўся на вышыні меней 200 метраў, ён быў нябачным для лакатараў.

Зараз сведчанняў становіцца менш, але пытанні застаюцца. Гэта хваля НЛА ў Бельгіі проста збівае з панталыку. Па-першае, чаму менавіта ў Бельгіі? Адкуль гэтыя тысячы сведчанняў за паўгода? Чаму ў папярэднія дзесяцігоддзі відавочцы гаварылі аб прызямленнях, у той час як цяперашнія НЛА не прызямляюцца? Чаму яны трохвугольныя (больш за 90 працэнтаў сведчанняў)? Усе гэтыя пытанні застаюцца пакуль без адказу.

МАРЫ-ТЭРЭЗА ДЭ БРОС.

# ДЛЯ ЦЯБЕ

## ПСІХАЛАГІЧНЫ ПРАКТЫКУМ

*Пэўна, даўно ўжо прыйшоў час развітацца з бабулінымі казкамі наконт таго, што, маўляў, поспех, шчасце і задавальненне — гэта ўсё, чаго трэба жадаць ад жыцця. Вельмі доўга нам гаварылі — а мы наіўна верылі — быццам пагоня за шчасцем так ці інакш вядзе да шчасця.*

*Але хопіць дурыць самім сябе рознымі прыгожымі гісторыямі. Час шчыра і прама паставіць пытанне: да чаго б мы ўсе прыйшлі і ў што б ператварыліся, калі б не было ў нас няшчасцяў? Яны нам проста страшэнна, у поўным сэнсе слова страшэнна, неабходны.*

*Прыклад, здольны запэўніць, наколькі ўсё гэта мэтазгодна,— нашы цеплакроўныя сабраты з царства звяроў, якія трапілі ў заапаркі. Вы толькі паглядзіце, да якіх катастрафічных вынікаў прыводзіць укрыццё і ўтрыманне гэтых цудоўных істот тут, дзе ім не страшны голад, дзе яны надзейна абаронены ад небяспекі і хвароб, нават зубнога болю. Але нарэшце яны ператвараюцца ў нейкія звярыныя падабенствы чалавечых псіхапатаў і неўрасценікаў.*

*Наш свет літаральна наваднёны незлічонымі кіраўніцтвамі, парадамі і рэцэптамі, якія на розныя лады вучаць нас, як быць шчаслівымі. Надышла пара кінуць выратавальны круг і тым абяздоленым, хто імкнецца стаць няшчасным. Колькі яшчэ псіхолагі і псіхіятры будуць рэўнасна захоўваць такія неабходныя гэтым людзям веды пра працэсы і механізмы, якія прывядуць іх да жаданага адчування няшчасця?*

*Трэба прызнаць, што на свеце існуе дастаткова многа людзей, якія ад прыроды надзелены талентам самастойна майстраваць сваё маленькае персанальнае пекла. Але ж яшчэ больш тых, каму неабходна дапамога і падтрымка.*

*Між тым карысная і патрэбная інфармацыя надта мізэрная, а калі і сустракаецца часам недзе ў спецыяльнай літаратуры, дык, як правіла, выпадкова, насуперак волі і намерам аўтара.*

*Мы ж збіраемся разгледзець практычныя рэкамендацыі, якія прыводзім ніжэй.*

# ЯК СТАЦЬ НЯШЧАСНЫМ?

## (парады вядомага псіхолага П. Вацлавіка)



ПРАКТЫКАВАННЕ 1.

Сядзьце ў зручнае, лепш за ўсё з падлакотнікамі, крэсла, закрыйце вочы і ўявіце сабе, што вы ўгрызаецеся ў таўстую лустачку сакавітага лімона. Пры невялікай трэніроўцы гэты ўяўны лімон здолее выклікаць у вас багатае слінавыдзяленне.

ПРАКТЫКАВАННЕ 2.

Па-ранейшаму заставайцеся ў крэсле і, не адкрываючы вачэй, перанясіцеся думкамі з лімона на свае ўласныя чаравікі. Наўрад ці вам спатрэбіцца шмат часу, каб усвядоміць, магчыма, упершыню ў жыцці, якія велізарныя нязручнасці прыносіць неабходнасць пастаянна насіць абутак. Няхай вас не засмучае, калі да гэтага моманту чаравікі здаваліся вам вяршыняй дасканаласці, галоўнае — як трэба сканцэнтравацца, і тады вы без намаганняў заўважыце, што дзесьці вам ціснe, вялікі палец вымушаны пастаянна знаходзіцца ў ненатуральна сагнутай паставе, шнуркі занадта туга сцягваюць ступню і да таго ж вас праследуюць нейкія няясныя, але яўна непрыемныя адчуванні холаду, спёкі, паколванні... Паўтарайце гэта практыкаванне да тае пары, пакуль нашэнне абутку са звыклай штодзённай неабходнасці не ператворыцца для вас ў сур'ёзную крыніцу дыскамфорту. Купіце сабе новую пару чаравікаў і заўважце: якімі б зручнымі не здаваліся яны вам у магазіне, усё роўна рана ці позна яны будуць прыносіць вам не менш нязручнасцей, чым старыя.

ПРАКТЫКАВАННЕ 3.

Заставайцеся ў крэсле, але на гэты раз павярніцеся да вакна і ўтаропце погляд на неба. Калі вам спадарожнічае хоць кропелька ўдачы, то не пройдзе і хвіліны, як перад вашымі вачыма пачнуць мільгацець мірыяды малюсенькіх кружкоў, накшталт бурбалак. Калі вы не варушыцеся, гледзячы прама перад сабой, бурбалкі павольна перамяшчаюцца ўніз, але варта толькі маргнуць, і яны зноў накіроўваюцца ўверх. Цяпер заўважце наступную асаблівасць: чым больш старанна канцэнтруеце вы ўвагу на гэтых самых кружках, тым большымі яны становяцца. Не выключана, што да вас незаўважна падкрадваецца якая-небудзь вераломная хвароба... Калі кружкі так і будуць увесь час павялічвацца ў памерах, то рана ці позна яны распаўсюдзяцца на ўсю зону бачнасці — а ці трэба гаварыць, як гібельна гэта можа адбіцца на вашым зроку. Наведайце акуліста. Ён, зразумела, запэўніць вас, што асцярогі зусім дарэмныя і размова ідзе аб нармальнай з'яве, якая носіць назву фасфен. Ну а што, калі ваш доктар, дапусцім, выпадкова захварэў адзёрам і не наведваў заняткі, на якіх у медінстытуце праходзілі вашу рэдкую і небяспечную хваробу?

ПРАКТЫКАВАННЕ 4.

Ну, вось, цяпер вы авалодалі ўсімі неабходнымі навыкамі, каб на некаторы час забыцца пра ўласныя немачы і звярнуць увагу на навакольны свет. Пачнём хаця б са светлафораў. Вы, пэўна, ужо заўважылі, што пакуль ваша машына далёка ад скрыжавання, упарта гарыць зялёнае святло, але вось вы пад'язджаеце бліжэй, і яно мяняецца на жоўтае ці чырвонае. Калі ў вас атрымаецца заглушыць у сабе голас розуму, які пастаянна сцвярджае, што ў сярэднім вы трапляеце на чырвонае святло так часта, як і на зялёнае, то поспех забяспечаны. Хутка пачнуць замацоўвацца падазрэнні, што супраць вас у гэтым свеце апалчыліся нейкія містычныя сілы.

ПРАКТЫКАВАННЕ 5.

Цяпер ёсць надзея, што вы пачалі ўсё больш і больш разумець, якія дзіўныя і падазроныя сувязі існуюць часам паміж самымі простымі і на першы погляд зусім незалежнымі адна ад другой падзеямі. Гэта дасць вам магчымасць разгледзець злавесныя прадвесці і заканамернасці, што маюць глыбінны сэнс і цалкам выслізгваюць ад поглядаў простых смяротных. Паспрабуйце ўважліва вывучыць свае ўваходныя дзверы, і вы, напэўна, рана ці позна выявіце на іх свежую драпіну, якую ніколі не бачылі раней. Цяпер задумайцеся над тым, што б гэта магло значыць? Магчыма, гэта метка, пакінутая злодзеям, або сляды няўдалага начнога рабавання? Ну, хутчэй за ўсё, вашай уласнасці нанёс шкоду нейкі ананімны нядобразычлівец ці проста ваша жыллё такім чынам намецілі таямнічыя зламыснікі. Тут таксама важна не паддацца спакусе махнуць на ўсё рукой і сказаць сабе: «А, гэта лухта...» Разам з тым не трэба ўпадаць у іншую крайнасць, спрабуючы знайсці ўсім гэтым з'явам рэальныя практычныя тлумачэнні. Галоўнае — разважаць аб праблеме ў чыста абстрактным інтэлектуальным плане, бо малюсенькая эксперыментальная праверка можа звесці да нуля ўсю эфектыўнасць гэтага практыкавання.

Калі вы ўжо прызвычаіліся пранікаць у сутнасць дзіўных, містычных сувязей паміж незалежнымі з'явамі і нават выпрацавалі ў гэтым свой уласны індывідуальны стыль, ваша натрэніраванае вока лёгка заўважыць, да якой ступені падзеі нашага штодзённага жыцця падуладныя ўплыву нетлумачальных і непрадказальных супадзенняў. Возьмем хаця б такі просты празаічны прыклад: вы стаіце на прыпынку, чакаючы аўтобус, і каб правесці час, чытаеце газету, але зрэдку паглядаеце ў канец вуліцы з надзеяй убачыць доўгачаканы аўтобус. І раптам нейкае шостае пачуццё гаворыць вам: «Ідзе!» Вы ўздымаеце вочы ад газеты і, зразумела, заўважаеце, што ў некалькіх кварталах ад прыпынку з'яўляецца жаданы аўтобус. Паказальна, ці не так? Але ж гэта не самы яскравы прыклад тых незлічоных выпадкаў амаль жахлівага чалавечага яснабачання, якое крышталізуецца ў нетрах вашай свядомасці, паслужліва канцэнтруючы ўвагу на ўсім, што нясе ў сабе патэнцыяльную пагрозу вашаму жыццю, маёмасці і спакою.

ПРАКТЫКАВАННЕ 6.

Як толькі вы дастаткова пераканаецеся ў тым, што вакол ўвесь час адбываюцца нейкія дзіўныя і падазроныя падзеі, у той жа час падзяліцеся сваім адкрыццём з сябрамі і знаёмымі, уключаючы ў выпадку неабходнасці і паштальёна. Бо няма лепшага сродка распазнаць, хто твой сапраўдны сябар, а хто — вераломны воўк, які наражаецца ў скуру авечкі, каб беспакарана плесці вакол вас змрочныя інтрыгі. Пры ўсім сваім спрыце — а можа менавіта дзякуючы яму — ён усё роўна выдасць сябе, ледзь толькі пачне пераконваць, што вы дарма сябе «заводзіце» і нічога падазронага ў вашыхназіраннях ён не бачыць. Між тым, гэта нас ніколькі не здзіўляе — зразумела ж, што, калі нехта цішком выношвае супраць вас вераломныя планы, ён ніколі адкрыта не прызнаецца ў гэтым. Наадварот, гэты суб'ект крывадушна паспрабуе адхіліць вас ад вашых быццам неабгрунтаваных падазронасцей і запэўніць у сваім добрым сяброўскім стаўленні да вас. Затое цяпер вы не толькі ведаеце, хто ўдзельнічае ў накіраванай супраць вас змове, але і канчаткова ўпэўнены, што такая змова сапраўды існуе — інакш навошта б вашым так званым «сябрам» так старанна пераконваць вас у адваротным?

Тыя, хто добрасумленна вывучылі прапанаваныя вышэй практыкаванні, зразумеюць, што незвычайныя на першы погляд здольнасці ствараць уласныя няшчасці зусім не з'яўляюцца прывілеяй геніяў. Навучыцца ўласнымі намаганнямі ствараць бязвыхадныя сітуацыі — здольнасць, якая пры невялікай трэніроўцы падуладна любому чалавеку сярэдняга ўзроўню. І тады, пакутуючы, ён атрымае асалоду ад уласнай бездапаможнасці перад тварам апалчыўшыхся супраць яго цёмных варожых сіл.

## ЗАПАВЕДЗЬ

# Дзесяць «не»

### якімі заваёўваецца свет

НЕ выходзьце на вуліцу ў брудным абутку.

НЕ насіце пакамечаны касцюм, неадпрасаваную кашулю і спадніцу.

НЕ торгайце субяседніка кожны раз, калі пажадаеце што-небудзь яму паведаміць.

НЕ шукайце выпадку пакпіць.

НЕ ешце лыжкай тое, для чаго прызначаны відэлец.

НЕ запэўнівайце жанчыну, з якой бачыліся ўчора, што сёння яна выглядае больш прывабна.

НЕ намазвайце маслам цэлую лусту хлеба. Ламайце яго на кавалкі і намазвайце іх.

НЕ пераносьце свой дрэнны настрой на тых, хто выпадкова апынуўся побач.

НЕ блытайце тэатр з магазінам. Там зусім не да месца распухлыя партфелі, скруткі, авоські.

НЕ забудзьцеся папрасіць прабачэння, калі прычынілі некаму неспакой.

## СКАРБОНКА КАРЫСНЫХ ПАРАД

# Каб перамагчы галечу

Ваша чарга на мэблю за гарамі, а паліроўка на старой секцыі выглядала не больш як прыстойна яшчэ ў мінулым дзесяцігоддзі? Можна ўзяць кусок мяккай тканіны, скамячыць і абгарнуць мяккай баваўнянай тканінай. Атрыманы тампон абмакнуць у раствор (з роўных частак піва і алею) і працерці мэблю. Не ўсю паверхню адразу, а невялікімі ўчасткамі.

* * *

Калі няма халадзільніка, а на талон можна атрымаць толькі 400 грамаў масла цалкам, запакуйце каштоўныя кавалкі (100—200 грамаў) у пергаментную паперу і апусціце ў салёную ваду, клапаціўшыся пра накрыўку. Можна загарнуць масла ў тканіну, намочаную ў сумесі воцату з вадой.

* * *

Каб захаваць на працягу доўгага часу ледзь здабытыя курыныя яйкі, памажце іх шмальцам, загарніце ў паперу, пакладзіце ў кошык і пакіньце ў халаднаватым месцы. Ці намажце бялком, дайце высахнуць і таксама пакладзіце ў кошык, загарнуўшы кожнае яйка ў паперу.

* * *

Пры варцы гародніны многія карысныя рэчывы пераходзяць у булён. Зборлівая гаспадыня выкарыстоўвае яго для прыгатавання супу.

## ЭКАНОМНЫЯ РЭЦЭПТЫ

# Не выкідвайце прадукты

Часам здараецца, ад снедання ці абеду застанецца, скажам, 300—400 грамаў макаронаў ці кашы. Хіба сённяшнім днём дапушчальна іх выкідваць? Лепш паставіць у халадзільнік, а на наступны дзень прыгатаваць з цёртым сырам. Ці заліць яйкамі, спачатку ўзбітымі з цукрам, і запекчы ў духоўцы.

**Дадаўшы да вязкай кашы яйкі, можна прыгатаваць катлеты ці біточкі.**

Смажаную рыбу, што засталася ад абеду, можна падаць на снеданне пад марынадам ці запекчы на грэнках з гароднінай і соусам. Смачны атрымаецца з яе і фарш — для піражкоў ці блінчыкаў.

**Рысавы адвар не спяшайцеся выліваць як непатрэбны. Ён асабліва карысны для тых, хто пакутуе на страўнікавыя захворванні. Для смаку яго можна падсаладзіць малінавым ці клубнічным варэннем.**

Адвар бурака можна выкарыстоўваць у запраўку для вінегрэту, для афарбоўкі баршчу, можна закісліць і спажываць затым у якасці буракговага квасу ў боршч.

**У час варкі макаронных вырабаў у адвар пераходзіць у сярэднім каля 8,5 працэнтаў сухіх рэчываў. Таму яго мэтазгодна выкарыстоўваць для прыгатавання заправачных пюрэпадобных супоў.**

Не выкідвайце яблычныя лупіны! Лепш наліце ў каструлю 2—2,5 шклянкі вады, апусціце ў яе лупіны і закіпяціце, дадаўшы цукар па густу. Атрыманы адвар — выдатны сродак супраць кашлю.

**Часта для прыгатавання кандытарскіх вырабаў выкарыстоўваюць толькі бялкі яек. З жаўткоў можна зрабіць маянэз. Гэта зусім не складана. Вазьміце сталовую лыжку парашку гарчыцы, 10 грамаў цукровага пяску, столькі ж солі і разатрыце. У другой пасудзіне падагрэйце (толькі не на адкрытым агні) адзін яечны жаўток і чвэрць лыжкі алею і паступова, у 5—6 прыёмаў, улівайце сумесь у гарчыцу. Расцірайце, каб на паверхні не было бліскавак. Маса павінна быць светлай, густой. Для вастрыні можна дадаць крышачку воцату.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

13 снежня

Заказ 2032.

Т. 2000 экз.



*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*



Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.